Адной барацьбы за вяршыню дастаткова,

каб запоўніць сэрца чалавека

Альбер Камю

Барацьба за дэмакратыю.

Крок. Яшчэ крок. Калі глядзіш на вяршыню, здаецца, што яна блізка. Падымаешся яшчэ, закідваеш галаву — яна гэтак жа блізка, але па-ранейшаму недасяжная. А навокал чыстае паветра, светлае неба і надзея…

Альбер Камю ў эсэ "Міф пра Сізіфа" піша пра самае вялікае няшчасце свайго героя. Філосаф гаворыць, што не так страшна несці свой камень угару і назіраць яго падзенне, як пакутліва ведаць: гэтак будзе кожны раз.

У сваіх работах Альбер Камю разглядае крызіс сэнсу чалавечага існавання. Філосаф дапускае, што Сізіф можа быць шчаслівым, бо ў яго ёсць выбар і шлях. Урэшце, усе мы жывём так: цягнем свой камень, хаця ведаем, што яму наканавана аднойчы скаціцца.

Чалавек няспынна шукае сэнс, штосьці, дзеля чаго варта было б жыць. Спрабуе запоўніць сэрца ідэяй, за якой будзе ісці ўгару. Гэта як вечная інтэлектуальная ежа. Пакуль знаходзішся ў працэсе спажывання, знешнія сілы не збіваюць, ты прыслухоўваешся да сябе і маеш шанс зразумець штосьці важнае.

Людзі побач, шмат людзей, але ніхто не можа сказаць табе, хто ты, адкуль, навошта і куды ідзеш. Толькі сам чалавек нясе свой камень угару і з ім — свае бясконцыя неспакойныя думкі.

У наш век машын і тэхналогій людзі ўжо не абавязаны шмат працаваць фізічна, у іх ёсць магчымасць выбіраць, чым заняць вольны час. І кожны сам вырашае, як распарадзіцца гэтай новай свабодай. Бязвольны чалавек, пазбаўлены неабходнасці штодзённай барацьбы за выжыванне, можа ўвогуле затрымацца ў стане прыемнага адпачынку. Навошта караскацца ўгару, калі і тут, унізе, усё ёсць? А на камень той можна накінуць посцілку і зладзіць добры стол. Зрэшты, геданізм і клопат выключна пра свае жаданні рэдка можа цалкам запоўніць сэрца.

Таму чалавек вольны, нават атрымаўшы магчымасць адпачыць, не кідае наканаваны яму камень. Яго заварожвае сам шлях угару, уласная энергія, якая перамагае сілу цяжару, адчуванне сваёй моцы і пачуццё маруднага, але няўхільнага набліжэння да неба. І чым вышэй ён падымаецца, тым шырэйшыя перад ім гарызонты, тым далей ён бачыць.

На шчасце, чалавек — істота біясацыяльная. У большасці выпадкаў хтосьці побач заўсёды падставіць плячо, падбадзёрыць. Нам важна аб'ядноўвацца з іншымі людзьмі, камунікаваць, адыграваць пэўную ролю ў чалавечых лёсах і грамадскіх працэсах. Нам неабходна час ад часу

збірацца ў талаку для сумесных спраў, адчуваць свой удзел і ўнёсак. Так, кожны цягне ўгару ўласны камень, але на гэтым пакручастым схіле жыцця мы ўпіраемся і крочым разам.

У пэўны момант чалавек адчувае свабоду і дзівіцца: што, так можна было і раней?! Зараджаюцца розныя, часта зусім новыя думкі. І ўсвядоміўшы сваю ўнутраную свабоду, чалавек хоча бачыць яе знешне.

Мы не можам сцвярджаць, што дэмакратыя — гэта ідэальная палітычная сістэма. Ува ўсім, што існуе, ёсць як перавагі, так і недахопы. Але дэмакратыя — гэта давер, спроба зафіксаваць і абараніць правы чалавека, даць яму магчымасць быць патрэбным грамадству. Гэта права людзей выбіраць сваіх прадстаўнікоў ва ўладзе, а ў выпадку нязгоды з нечым — выказаць свой пратэст. Дэмакратыя забяспечвае людзям іх асноўныя свабоды, сістэму самакіравання. Пры ёй народ не проста аднойчы пагаджаецца на пэўнага кіраўніка, а бачыць працу дзяржаўнага апарата і можа ўплываць на рашэнні ўрада.

Барацьба за дэмакратыю абумоўлена жаданнем знайсці свабоду. Мы хочам вучыцца, ствараць аб’яднанні, дзяліцца сваімі ўменнямі, ладзіць яркія імпрэзы. Мы ведаем, як гэта можна зрабіць цікава і карысна для людзей. І нам вельмі складана жыць у свеце, дзе мы бачым свае мажлівасці, але не можам рэалізавацца праз страх наступстваў.

Барацьба за дэмакратыю вечная, як супрацьстаянне дабра і зла. Немагчыма заваяваць гэтую вышыню, супакоіцца і спыніцца. Штодня трэба абараняцца ад першабытнага варварства, якое імкнецца вырвацца з-пад цывілізацыйнай накрыўкі. Кажуць, што чалавека ад звера аддзяляе толькі тонкі слой культуры. Ці можа гэты слой быць большым, чым унутраннае пачварства дзікай чалавечай прыроды? Магчыма. Але не зараз.

Нельга аднойчы перамагчы, а далей быццам бы ўсё пойдзе само. Не, не пойдзе. Толькі вольнае грамадства можа стварыць і падтрымліваць дэмакратыю. Праўда, аднак, у тым, што толькі ва ўмовах дэмакратыі фарміруецца і ўзнаўляецца вольнае грамадства. Замкнёнае кола, выйсце з якога могуць знайсці пасіянарыі, асобы, гатовыя ахвяраваць сабой дзеля свабоды свайго народа.

Няма нічога ідэальнага, і ўсё жыццё чалавек павінен прарывацца праз гэтую непрыгожую ісціну. Нельга стварыць абсалют і задаволіцца. Барацьба — гэта шлях, і часам ён важнейшы за вынік. У дарозе Сізіф чалавек знаходзіць радасці маленькіх перамог, рашэнняў, пачуццё годнасці і ўласнай значнасці. У барацьбе — знаходзіць блізкіх па духу людзей, надзею, веру ў будучыню. Ідучы, чалавек робіць нешта не толькі для сябе цяперашняга, а і для сябе будучага. У яго з’яўляюцца сілы.

Нерэальнасць глабальнай ідэі — адначасова і вялікі недахоп, і неверагодны плюс. Калі ставіш перад сабой дакладныя і зразумелыя мэты, напрыклад, набыць машыну ці пачаць зарабляць пэўную суму грошай, то адразу адчуваеш, калі нічога не атрымоўваецца. А калі перад чалавекам стаіць вялікая мэта, дайсці да якой вельмі складана, ён атрымлівае пэўную асалоду ад працэсу, разумее сваю важнасць і пры гэтым не пакутуе ад таго, што не дамогся хуткіх вынікаў. Таму падобная мэта — гэта і пэўнае расчараванне, і вечнае натхненне.

Часам чалавек робіць сваю справу, ведаючы, што не дойдзе да канца: не хопіць часу. І ён цешыць сябе надзеяй, што яго справу працягнуць іншыя. Спяшаецца, каб пабудаваць падмурак. Чалавек баіцца смерці, таму яму важна застацца тут. Пакінуць свае ідэі, думкі, творы. Сам не адужае, але падхопіць і завершыць хтосьці іншы. Ісці за дэмакратыяй — значыць перадаваць свае ідэалы камусьці яшчэ. Часам адна гэта думка можа запоўніць сэрца чалавека. І барацьба за дэмакратыю натхняе не толькі змагара, але і тых, хто бачыць яго шлях.

У першым артыкуле Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека гаворыцца, што ўсе людзі нараджаюцца вольнымі і роўнымі ў сваёй годнасці і правах. Дасягнуць гэтага складана, але калі не спрабаваць, то можна забыцца на падобныя ідэі. Таму трэба змагацца. Узяць той камень і валачы ўгару. Не назіраць, не баяцца, не адседжвацца ў сваёй хаце з краю, а пачаць свой шлях. Ісці і ў кожным сваім кроку адчуваць свабоду. Натхняцца і натхняць. Здзіўляцца і здзіўляць. Напаўняць сваё сэрца і кожны раз знаходзіць сэнс. Углядацца ў неба, дыхаць на поўныя грудзі і ісці ў пад’ём. Рабіць крок. І яшчэ крок…